# ГУЛЬНЯ - ВІКТАРЫНА «МАЯ ЛЮБАЯ СТАРОНКА»

для дзяцей старшай групы (5-7 гадоў)

***Кульбей Наталля Чаславаўна,***
*выхавальнік дашкольнай адукацыі*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гезгалаўскі яслі-сад”*

**Праграмныя задачы:**
працягваць фарміраваць вобраз малой радзімы (аг. Гезгалы);
пашырыць уяўленні аб гісторыі, установах сацыяльнага прызначэння (6-7 гадоў);
замацаваць уяўленні аб прыродным асяроддзі, знакамітых людзях (5-6 гадоў);
развіваць камунікатыўныя ўменні, хуткасць мыслення, кемлівасць; выхоўваць пачуццё любові да малой радзімы, культуру паводзін.

**Матэрыялы**: эмблемы каманд “Васілёк” і “Рамонак” (па колькасці ўдзельнікаў), мультымедыйная прэзентацыя “Мая малая радзіма- аграгарадок Гезгалы”, 2 карты Беларусі з 6 частак для складання, 2 камплекты картак з выявамі гербаў гарадоў Беларусі, кубы з выявамі частак ракеты, абеліска; прызы для ўдзельнікаў.

**Ход:**

*Гучыць урачыстая музыка. У залу заходзяць выхаванцы. У кожнага ўдзельніка на грудзях эмблема каманды.*

**Вядучы.** Добры дзень!

Знаўцаў шчыра я вітаю,
Да гульні ўсіх запрашаю.
Бачу, што ўсё гатова -
Значыць трэба пачынаць.
Аб старонцы нашай роднай
Сёння будзем размаўляць.
*Дзеці садзяцца на крэселкі.*

*У залу забягае Вася Вясёлкін (карэспандэнт часопіса “Вясёлка”).*

**Вася Вясёлкін:** Пачакайце! Пачакайце! Добры дзень усім! Прабачце мяне, калі ласка, што затрымаўся! Я - Вася Вясёлкін, карэспандэнт часопіса “Вясёлка”. Ад рэдакцыі часопіса я атрымаў заданне напісаць артыкул пра ваш аграгарадок Гезгалы, каб усе чытачы даведаліся, якая цудоўная мясціна ёсць на Дзятлаўшчыне. На сайце вашага садка я прачытаў, што менавіта сёння ў вас адбудзецца гульня-віктарына на тэму “Мая любая старонка”. Гэта так, дзеці, я не памыліўся? (*адказы дзяцей*).

**Вася Вясёлкін:** Калі ласка, дазвольце мне папрысутнічаць і задаць некалькі пытанняў!

**В.:** Аб чым ты хочаш даведацца?

**Вася Вясёлкін:** *(на мультымедыйным экране з'яўляюцца знакі-сімвалы).* Я хачу дакладней даведацца пра геаграфічнае размяшчэнне, гісторыю, прыродныя асаблівасці і ўстановы вашага аграгарадка.

| | |
|---|---|
|  |  |
|  |  |

**Вядучы:** Я ўпэўнена, што ты абавязкова атрымаеш адказы на ўсе пытанні.
Каманды гатовы? *(звяртаецца да дзяцей).*
**Вядучы:** Сёння ў нас будуць спаборнічаць дзве каманды. Капітаны, калі ласка, прадстаўце нам свае каманды!

*Каманды ўстаюць з крэселак.*

**Капітан 1 каманды**

У шоўк зялёны апрануўся
Кожны родненькі куток.
Хто ў жыце нарадзіўся?
Сіні-сіні… (васілёк) *(каманда гаворыць разам слова "васілёк").*

**Вядучы:** Першая каманда называецца "Васілёк".

**Капітан 2 каманды**

Быццам сонейка ў лузе,
Кветачка прыгожая.
У сукенцы, як з пялёнак
Вабіць раніцай… рамонак *(каманда гаворыць разам слова "рамонак").*

**Вядучы:** Другая каманда называецца "Рамонак". Вось якія прыгожыя назвы выбралі каманды! За кожнае правільна выкананае заданне і дакладны адказ каманда будзе атрымліваць кветачку: васілёк ці рамонак. У канцы гульні мы іх падлічым і вызначым пераможцаў. *(папяровыя кветкі размяшчаюцца на магнітнай дошцы).*

*Каманды садзяцца.*

**Вядучы:**

Першае заданне для капітанаў.
Капітанам каманд трэба скласці карту Рэспублікі Беларусь і назваць вобласці. А для ўдзельнікаў каманд Вася Вясёлкін правядзе бліц-апытанне.

*Кожны капітан складае карту Беларусі з 6 частак (абласцей).*

*У той час, калі капітаны збіраюць карту, Вася Вясёлкін праводзіць бліц-апытанне каманд.*

- Як называецца краіна, у якой мы жывем?
- Назавіце дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь?
- Назавіце сталіцу Беларусі?
- У якой вобласці мы жывем?

- Як называецца наш раён?
- Як называецца аграгарадок, у якім мы жывем?
- Якія вёскі знаходзяцца побач?
- Якая рэчка цячэ ў Гезгалах?

*Вядучы падводзіць вынікі. За дакладныя адказы каманда атрымлівае кветачкі.*

**Вядучы:** Беларускі народ склаў шмат прыказак і прымавак аб сваёй роднай старонцы. Давайце іх успомнім. Я буду пачынаць, а вы працягвайце.

- У чужой старонцы….не так свеціць сонца.
- Усюды добра, … а дома лепей.
- Дома і вуглы … дапамагаюць.
- Няма смачней вадзіцы, …. як з роднае крыніцы.
- Усякай птушцы … свае гняздо міла.
- Дзе маці нарадзіла,…там і Радзіма.

**В.** Сапраўды, нездарма ў народзе кажуць "Дзе нас маці нарадзіла, там і наша Радзіма". Наша малая Радзіма – аграгарадок Гезгалы. Гэта прыгожы, чароўны край, з цікавай гісторыяй. Наступнае заданне пакажа, ці ведаеце вы гісторыю свайго аграгарадка.

**В.** Для выканання наступнага задання нам патрэбны па аднаму ўдзельніку ад кожнай каманды. Калі ласка, паслухайце заданне. Перад вамі на сталах знаходзяцца выявы гербаў розных населеных пунктаў. Вам неабходна знайсці сярод іх герб Гезгалаў.

**Заданне "Знайдзі герб аг.Гезгалы"**

*Удзельнікам прапануюцца выявы гербаў розных населеных пунктаў, сярод якіх неабходна знайсці герб Гезгалаў. Перамагае той, хто хутчэй знойдзе герб Гезгалаў.*

*Пасля таго, як дзеці знойдуць герб, яго выява з'яўляецца на мультымедыйным экране.*

**Вася Вясёлкін:** *(звяртаецца да дзяцей).* Паглядзіце на экран! Як вы лічыче, ці правільна выканалі заданне прадстаўнікі вашых каманд?

**Дзеці**: Правільна.

**Вася Вясёлкін:** Як вы лічыце, дзеці, ці можа герб паведаміць аб гісторыі і жыхарах населенага пункта?

**Дзеці**: Можа.

**Вася Вясёлкін:** Мяне вельмі цікавіць гісторыя вашага аградарадка. Дазвольце мне задаць пытанні камандам.

**Пытанні да каманд:**

- Як завуць святога, які знаходзіцца ў цэнтры герба? *(Уладзімір Гезгальскі).*
- Чаму менавіта Уладзімір Гезгальскі адлюстраваны на гербе?*(жыхар вёскі Гезгалы, святар царквы).*
- Што сімвалізуе на гербе зялены колер і ключы?*( прыроду і гасціннасць нашых людзей).*
- Што азначае блакітны колер і голуб? *(жаданне міру і веру ў Бога)*

**Вядучы** *(звяртаецца да Васі Вясёлкіна):* Наступнае заданне таксама паведаміць аб цікавых старонках гісторыі нашага населенага пункта. Кожнай камандзе трэба скласці карцінку з частак, а часткі намаляваны на гранях кубоў.

**Заданне "Складзі карцінку з частак"**

*Камандам прапануецца скласці карцінку з 6 частак (часткі намаляваны на гранях кубоў памерам 20х20см) і растлумачыць, як атрыманая выява прадмета звязана з гісторыяй аграгарадка.*

*Каманда "Васілёк" складае карцінку "ракета" (сімвалізуе тое, што Гезгалы - былы ваенны гарадок; тут знаходзіліся ваенныя ракеты).*

*Каманда "Рамонак" складае карцінку "абяліск" (жыхары Гезгалаў былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны).*

**Вядучы:** Вось бачыш, Вася, нашы выхаванцы цікавяцца гісторыяй свайго аграгарадка. Вельмі хутка яны стануць вучнямі і на ўроках гісторыі даведаюцца аб новых старонках жыцця сваёй малой радзімы.

*Вася Вяселкін падводзіць вынікі.*

**Вася Вясёлкін:**Я чуў, што ў вашым аграгарадку жыве знакамітая паэтэса. Хто назаве яе прозвішча?

**Дзеці**: Вера Ігнатаўна Хрышчановіч

**Вася Вясёлкін:** А можа вы ведаеце верш, які яна напісала?

*2 дзіцяці разам з выхавальнікам чытаюць верш В.І. Хрышчановіч "Калабочкі".*

**Верш "Калабочкі"**

**В:**

Калабочкі, калабочкі
Хоць бяры вас абдымай,
Вам сыночкі, і вам, дочкі,
Тут калыскай родны край.

**1 дзіця**

Азірніся ж ты наўкола,
Тут і рэчка, тут і лес,
Тут і клуб для нас, і школа
Тут і возера, і ГЭС.

**2 дзіця**

Прыгажосці той нямала,
Каб дужэлі мы штодня,
Каб нам сонейка ўставала,
Каб зязюлька кукавала,
Каб квітнела ўся радня.

*Верш суправаджаецца слайдамі прэзентацыі (выявы рэчкі, лесу, возера).*

**Вася Вясёлкін**: І сапраўды, у вашым пасёлку такая прыгажосць! Хваёвы лес – рукой падаць, і хвалістая рэчка, і квяцісты луг побач! Мне вельмі хочацца падрабязней даведацца аб раслінах і жывёлах вашай мясцовасці.

**Вядучы**: Вася, ты абавязкова пра ўсё даведаешся, бо наступнае заданне для каманд **"Кожнаму свой дом".** Удзельнікі каманд павінны засяліць супольніцтвы "Лес " і "Возера". Каманда "Васілек" павінна выбраць карткі з жыхарамі лесу і размесціць іх на планшэте, а каманда "Рамонак" знойдзе і размесціць на планшэце жыхароў возера.

*Гучыць аўдыязапіс "Гукі лесу".*

*Дзеці каманды "Васілёк" выбіраюць карткі з жыхарамі прыроднага супольніцтва "лес", размяшчаюць іх на планшэце. Вася Вясёлкін правярае, ці правільна выканана заданне.*

*Дзеці каманды "Рамонак" выбіраюць карткі з жыхарамі прыроднага супольніцтва "Возера", размяшчаюць іх на планшэце.*
*Вядучы правярае, ці правільна выканана заданне.*
*Вася Вясёлкін падводзіць вынікі.*

**Вася Вясёлкін:** Дзеці, а якія беларускія народныя гульні вы ведаеце? Я прапаную пагуляць у вясёлую народную гульню "Міхасік".

**Народная гульня "Міхасік"**

*Па крузе ставяцца лапці (на 1 пару меньш, чым удзельнікаў). Удзельнікі становяцца вакол лапцяў і гавораць такія словы:*
*Ты, Міхасік, не зявай!*
*Хутка лапці абувай!*
*Гучыць беларуская народная мелодыя. Удзельнікі, выконваючы танцавальныя рухі, перамяшчаюцца па крузе.*

*Па сігнале (змаўкае музыка) кожны стараецца хутка «абуць» лапці. Удзельнік, які застаўся без лапцяў, становіцца ў цэнтр круга і паказвае танцавальныя рухі, якія паўтараюць усе гульцы. Гульня праводзіцца некалькі разоў.*

**Вася Вясёлкін:** Сёння я пабываў у розных установах вашага аграгарадка, зрабіў многа фотаздымкаў. Але не запомніў, на якім фотаздымку, якая ўстанова адлюстравана. Дапамажыце мне, калі ласка. Здагадайцеся па апісанню і назавіце ўстановы.

**Гульня "Адгадай аб'ект па апісанню"**

*Вася Вясёлкін дае апісанне адметных асаблівасцей аб'ектаў сацыяльнага абслугоўвання аграгарадка. Дзеці адгадваюць і называюць.*

- У гэтым будынку можна адправіць паштоўку, набыць часопіс ці газету (Пошта).
- У гэтым будынку можна купіць прадукты харчавання (Магазін).
- У гэтай установе дзеці вучацца чытаць і пісаць (Школа).
- У гэтым будынку можна навучыцца іграць на розных музычных інструментах (Музычная школа).

**Вася Вяселкін**. А зараз я прапаную капітанам каманд самім апісаць якую-небудзь установу, а удзельнікі процілеглай каманды павінны адгадаць.

**Капітан каманды "Васілек".** У гэтай установе можна ўзяць кнігу, каб пачытаць дома (Бібліятэка).

**Капітан каманды "Рамонак".** Гэту установу мы наведваем часцей за ўсе тады, калі захварэлі (Амбулаторыя).

**Вядучы:** Апошняе заданне для каманд - гульня "Так ці не".

**Вася Вясёлкін:** Толькі будзьце ўважлівымі!

**Гульня "Так ці не"***(праводзіць вядучы).*

*Каманды па чарзе адказваюць на пытанні.*

**Пытанні:**

- У нашым аграгарадку ёсць Дварэц спорта *(не).*
- У нашым аграгарадку ёсць трэнажорная зала *(так).*
- У нашым аграгарадку ёсць мятро *(не).*
- У нашым аграгарадку ёсць Школа мастатваў *(так).*
- На нашай малой Радзіме жывуць толькі беларусы *(не).*
- Па вуліцам аградарадка ездзяць тралейбусы *(не).*
- Жыхары аграгарадка ганарацца сваей малой радзімай *(так).*
- Жыхары аграгарадка любяць сваю малую радзіму *(так).*

*Вася Вясёлкін рыхтуецца да падвядзення вынікаў (падлічвае кветачкі кожнай каманды).*

**Вядучы**: Паважаныя знаўцы сваёй малой радзімы! Падыйшла да завяршэння наша гульня. Сёння я яшчэ раз упэўнілася, што вы, маленькія беларусы, цікавіцеся гісторыяй і культурай сваёй малой радзімы, любіце і ганарыцеся зямлёй, на якой нарадзіліся. Пакуль Вася Вясёлкін падводзіць вынікі гульні-віктарыны, прапаную вам завяршыць нашу калектыўную работу “Мая любая старонка”, упрыгожыць рамку і падарыць яе Васю Васёлкіну на памяць.

*Дзеці ўпрыгожваюць рамку сілуэтамі сардэц, выразаных з клейкай паперы, і гавораць словы-пажаданні сваёй малой радзіме.*

*(Напрыклад: я жадаю Гезгалам квітнець; я жадаю Гезгалам міра; я жадаю, каб тут заўсёды было многа гасцей і г.д.).*

*Вася Вясёлкін падводзіць вынікі і ўзнагароджвае пераможцаў.*

**Вася Вясёлкін:** Дзякуй вам, дзеці! Я атрымаў адказы на ўсе пытанні, шмат даведаўся аб вашай малой радзіме і абавязкова напішу артыкул пра аграгарадок Гезгалы! Да пабачэння!

*Пад урачыстую музыку ўдзельнікі выходзяць з залы.*

**Літаратура:**

1. Дубініна, Д. М. Свет вакол мяне : вучэб.-метад. дапаможнік для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з беларускай мовай навучання / Д. М. Дубініна. –2-е выд., пашыр. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – 56 с. (ВМК «Мае першыя ўрокі»).

2. Старжынская, Н.С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў: вучэбна-метадычны дапаможнік для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – 2-е выд.. – Мінск : Аверсэв, 2018. –182, [1] с.. – (Я мову родную люблю).